

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №1 (26)
Верасень 2022

## У нумары:

**Дзень ведаў** — **Стар. 1**

**Дзень народнага адзінства** — **Стар. 2**

**Пачаў дзейнічаць Клуб рэдактараў школьных газет** — **Стар. 3**

**Віншуем творчы калектыў аб’яднання “Натхненне” з перамогай у раённай выставе** — **Стар. 4**

**Шосты школьны дзень** — **Стар. 5**

**Віншуем з Днём настаўніка!!!** — **Стар. 6**

# Дзень ведаў - 2022

Першага верасня ў школе прайшла ўрачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў. Па традыцыі першым трымаў слова дырэктар школы. Аляксандр Сяргеевіч павіншаваў педагогаў, вучняў і іх бацькоў з пачаткам новага навучальнага года.

Пасля ўрачыстай лінейкі вучні адправіліся ў свае класы, дзе для іх прайшоў першы ў новым навучальным годзе ўрок "Гістарычная памяць - дарога ў будучыню". Вучні 9 класа сталі ўдзельнікамі адкрытага ўрока з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам.

Пасля ўрокаў адбылося ўрачыстае ўскладанне кветак ля помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.







# Дзень народнага адзінства




У 2021 годзе ў календары Рэспублікі Беларусь з'явілася новае дзяржаўнае свята, якое адзначаюць 17 верасня - **Дзень народнага адзінства**. Дата невыпадковая: 17 верасня 1939 года пачалося ўз'яднанне Заходняй і Ўсходняй Беларусі. Гэты дзень стаў актам гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да беларускага народа, падзеленага супраць яго волі ў 1921 годзе па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора. Аднаўленае адзінства дазволіла Беларусі выстаяць у Вялікай Айчыннай вайне, стаць адной з краін-сузаснавальніц ААН.

Новае свята - нагода задумацца аб значэнні памяці і ўласнай гісторыі, аб тым, што замоўчванне яе старонак не праходзіць бясследна. Уз'яднанне беларускага народа ў 1939 годзе стала найважнейшай падзеяй у яго лёсе. Узгадваючы падзеі мінулага, мы павінны разумець, што нашыя дзеянні павінны быць накіраваныя на папярэджанне грамадскіх канфліктаў, сацыяльнай і палітычнай варожасці, страты дзяржаўнага суверэнітэту. Нам трэба навучыцца слухаць і чуць адно аднаго, паважаць розныя меркаванні, імкнуцца да згоды. Традыцыі святкавання Дня народнага адзінства толькі пачынаюць складацца. Важна, каб кожны беларус знайшоў у гэтым свяце асабісты сэнс.

Згуртаванасць, салідарнасць і ўзаемаразуменне беларусаў, аб'яднаных гісторыяй, традыцыямі, культурай і агульным духам павагі і роўнасці - гэтыя якасці заўсёды былі галоўнымі для беларусаў, такімі і павінны заставацца.

17 верасня адміністрацыя і педагогі нашай школы прынялі ўдзел у Мітынгу на брацкіх могілках г. Дзяржынска і ў аўтапрабегу па месцах баявой славы, воінскіх пахаваннях, мемарыяльных комплексах. У рамках аўтапрабегу адбыўся мітынг каля памятнага знака ў в. Чэрнікаўшчына, прысвечаны Дню народнага адзінства з удзелам вучняў і іх законных прадстаўнікоў.









# Пачаў дзейнічаць Клуб рэдактараў школьных газет




З гэтага навучальнага года ў Дзяржынскім раёне пачаў дзейнічаць Клуб рэдактараў школьных газет. Першае паседжанне Клуба адбылося 10 верасня на базе СШ №2 г.Дзяржынска. Нашу школу прадстаўляла вучаніца 8 класа, галоўны рэдактар школьнай газеты “Крынічка” – Ярашэвія Мар’яна.






13 верасня на базе ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Фаніпаля" адбылося другое пасяджэнне Клуба рэдактараў. Рэдактары школьных газет устаноў адукацыі Дзяржынскага раёна абмяркоўвалі праблему распаўсюджвання фэйкаў у сродках масавай інфармацыі, вучыліся распазнаваць фэйкавую інфармацыю і супрацьстаяць яе распаўсюджванню.

У пасяджэнні Клуба прыняла ўдзел Коршун Ларыса Міхайлаўна, генеральны дырэктар УП "Інфармацыйнае агенцтва "Мінская праўда". Ларыса Міхайлаўна расказала пра свой вопыт работы ў сферы журналістыкі, а напрыканцы сустрэчы правяла аўтограф-сесію.

Мадэратарам Клуба рэдактараў з’яўляецца Гапанькова Г.У., начальнік упраўлення адукацыі, спорту і турызму Дзяржынскага райвыканкама.







# Віншуем творчы калектыў аб’яднання “Натхненне” з перамогай у раённай выставе

16 верасня ў аграгарадку Забалацце ў рамках раённага фестывалю-кірмашу "Дажынкі-2022" прайшла выстава-конкурс "Шчодрыя дары восені", у якой прынялі ўдзел 25 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Выстава афармлялася па наступных намінацыях: "Вясёлая гародніна, садавіна, кветкі" і "Вось так цуд - Волаты!". Удзельнікі выставы паказалі высокі ўзровень творчых здольнасцей навучэнцаў і іх бацькоў, майстэрства педагогаў, арыгінальнасць ідэй.

У намінацыі "Вясёлая гародніна, садавіна, кветкі" творчы калектыў навучэнцаў **аб'яднання "Натхненне"** нашай установы пад кіраўніцтвам настаўніка працы **Налёткі Марыны Аляксандраўны** быў удастоены **дыплома II ступені** за прадстаўленую кампазіцыю "Гаспадыня школьнай грады".





Віншуем пераможцаў і жадаем далейшых творчых поспехаў!!!




**Падпісвайцеся на наш афіцыйны тэлеграм-канал!!!**

**Там вы знайдзеце самыя актуальныя навіны з нашага школьнага жыцця!!!**

# Шосты школьны дзень




**10 верасня** шосты школьны дзень ва ўстанове прайшоў пад дэвізам **"Дзень здароўя"**. Дзеці наведалі ў школьнай бібліятэцы кніжную выставу, прысвечаную здароваму ладу жыцця. Вучні 1-4 класаў прынялі актыўны ўдзел у віктарыне "Па сцяжынках здаровага ладу жыцця", а вучні 5-9 класаў абмеркавалі падчас круглага стала ўплыў шкодных звычак на арганізм чалавека. Дзеці прынялі актыўны ўдзел у спартыўна-турыстычным турніры.





У рамках шостага школьнага дня **17 верасня** сярод навучэнцаў 5-9 класаў адбыўся **турнір "У адзінстве народа - вялікая сіла"**. Рабяты адказвалі на пытанні, якія тычацца гістарычных падзей нашай Радзімы, узгадалі вядомых пісьменнікаў і паэтаў Беларусі, паўдзельнічалі ў тэматычных гульнях і конкурсах. Прыйшлі да высновы, што для захавання незалежнасці краіны мы павінны беражліва адносіцца да гістарычнай спадчыны, памнажаць тое лепшае, што пакінулі нам папярэднія пакаленні. Для будучага росквіту краіны мы павінны быць адзінымі!





Шосты школьны дзень 30 верасня быў прысвечаны адной з самых галоўных прафесій - **прафесіі Настаўнік**! Круглы стол, інтэрактыўная выстава ў бібліятэцы, майстар клас чакалі рабят у гэты восеньскі дзень.





# Віншуем з Днём настаўніка!!!




Дарагія калегі, ветэраны педагагічнай працы!

У гэты цудоўны восеньскі дзень мы рады павіншаваць вас з надыходзячым прафесійным святам - Днём настаўніка! Ва ўсе часы да працы педагога прад'яўляліся самыя высокія патрабаванні. Менавіта настаўнік заўсёды быў узорам высокай духоўнай сілы, эрудыцыі, інтэлігентнасці! І ўсе гэтыя якасці ўвасаблялі і ўвасабляюць нашы цудоўныя педагогі.

Жадаю вам прафесійных і творчых поспехаў, поспехаў у вашай нялёгкай, але патрэбнай справе, цярпення, аптымізму, моцнага здароўя і шчасця.

З павагай,
дырэктар школы Крываротт А.С.

30 верасня актавая зала школы сабрала усіх настаўнікаў на святочны канцэрт, прымеркаваны да Дня настаўніка. Вучні падрыхтавалі цудоўныя віншаванні. Дырэктар школы Краварот А.С. уручыў настаўнікам падзякі на плённую працу у галіне адукацыі.








Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар’яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 кастрычніка.